«ВЫРАТАВАНКА» ДЛЯ ФАБЕРЖЭ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рэчы, прадстаўленыя ў брэсцкім музеі выратаваных каштоўнасцяў, перадавалі з мытні пачынаючы яшчэ з 1953 года. Дарэчы, акурат тады, у 1950-я гады, затрымалі адразу 30 ікон! Музея яшчэ не было: яго адкрылі толькі ў 1989 годзе. Але ў фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея ўвесь час паступалі прадметы з мытні. Таму пазней вырашылі стварыць асобны музей такой тэматыкі.

У дзень адкрыцця музея перагарадзілі ўсю вуліцу Леніна, згадваюць відавочцы тых падзей. Было столькі груп наведвальнікаў, што музей працаваў да 10 гадзін вечара.

Першая зала акурат прысвечана самой брэсцкай мытні. Тут можна ўбачыць розныя патайнікі. Напрыклад, скрынка ад абутку служыла патайніком для чатырох ікон: вонкава яна не прыцягвала ўвагі, унутры была запячатана фольгай, па вазе адпавядала свайму стандарту. Таму вызначыць, што ў ёй кантрабанда, было нялёгка, аднак гэта ўдалося зрабіць. Побач у экспазіцыі можна ўбачыць цукерніцу — сценка ў ёй ссунутая, а ўнутры відаць старыя сярэбраныя манеты.

У музеі ёсць прылада, якая вызначае вадзяныя знакі: яе падключаюць да сеціва, загараюцца два промні, чырвоны і сіні, — і вось ужо справа на банкноце праяўляецца партрэт Кацярыны II.

У наш час тэхналогіі прасунуліся далёка наперад і вельмі дапамагаюць мытнікам у іх справе. Так, сёння выкарыстоўваецца сканаванне велікагрузных машын. Гэты працэс дазваляе выявіць зброю, наркотыкі, антыкварыят. Знайшоўшы каштоўныя прадметы, мытнікі перадаюць іх для судовага разбору. Затым рэчы паступаюць у музеі нашай краіны, у тым ліку ў музей выратаваных каштоўнасцяў.

Распілаваныя іконы...

Даволі значную частку экспазіцыі займаюць старыя іконы. Яны часта траплялі ў музей у распілаваным выглядзе: некаторыя з іх распілоўвалі нават на шэсць частак. Аднак сучасныя спосабы рэстаўрацыі дазваляюць аб'яднаць іх усе, прычым без зрухаў.

Перад тым як вывезці ікону, чалавек мог даволі доўга чакаць зручнага моманту: адна з ікон у распілаваным выглядзе ляжала 25 гадоў.

Такія творы традыцыйна пішуцца на дрэве. У музеі ёсць старая ікона XVI стагоддзя, якая была знойдзена ў кантрабандыстаў у 1960-я гады. Часта такія іконы везлі з храмаў, магчыма, нават з алтароў. Сярод асабліва каштоўных — абраз Божай Маці Уладзімірскай. Па тыпе напісання гэта Елеуса — на правай руцэ жанчына трымае немаўлятка Ісуса Хрыста, які пяшчотна прыціскаецца да шчакі маці.

Яшчэ адна асабліва каштоўная ікона ў экспазіцыі музея — Спас у Сілах. Яна прадстаўлена пасля рэстаўрацыі, а датуецца таксама XVI стагоддзем.

У калекцыі ёсць і вельмі цікавы іканастас, затрыманы ў фургоне. Дарэчы, такія прадметы даволі часта спрабуюць вывезці ў фурах, хаваючы сярод асабістых рэчаў. У свой час гэты іканастас склалі — ён атрымаўся невялікага памеру — і так спрабавалі перавезці. Аднак нейкім дзівосным чынам Аляксандр Круковіч (вядомы мытнік, які ўжо пайшоў з жыцця, але паспеў раскрыць шмат тайнікоў) адшукаў яго ў фургоне. Іканастас датуецца XIX стагоддзем, ён трохрадны.

У цэнтры адной з залаў — вялізнае Напрастольнае Евангелле. Гэта царкоўная кніга, якая была знойдзена ў 1960-х гадах у рэчах дыпламата. Аклад датуецца 1761 годам, выкананы ў Санкт-Пецярбургу. Пад прыгожым сярэбраным акладам усе старонкі ў поўнай захаванасці — агулам іх каля 300. Напісана кніга на царкоўнаславянскай мове двухкаляровым ручным друкам, і ўсе літары ўпрыгожаны раслінным арнаментам.

І Фабержэ!

Як працавалі ювелірныя майстэрні ў XIX стагоддзі? Адразу ўспамінаецца фірма Фабержэ, якая паспяхова працавала з 1842 года да 1917-га. Фабержэ стварылі калекцыі па сезонах і прадавалі іх у крамах. Калі калекцыя не распрадавалася цалкам, яе забіралі, перапрацоўвалі і рабілі зусім іншую калекцыю. У фірме працавала каля дзесяці майстроў — іх імёны ўвайшлі ў гісторыю ювелірнага мастацтва.

У брэсцкім музеі ёсць нефрытавы нож ад Фабержэ — ручка выканана з серабра, а лязо — зялёны нефрыт — з уральскіх самацветаў. Гэта нож для разразання паперы, яго выкарыстоўвалі, каб адкрываць лісты. Побач запалачніца ў выглядзе невялікага грыба. Унутры стаялі запалкі, аб грыб, зроблены з серы, яны падпальваліся: падстаўка з'яўляецца дзейнай. Такіх грыбоў Фабержэ выпусцілі даволі шмат.

Ёсць і туалетныя прылады легендарнай фірмы: флакон для парфумы, пудраніца, скрыначка, ваза ручной работы. Тулава вазы ўпрыгожана алмазнай рэззю, якой займаліся майстры на шкляным заводзе ў Рызе. У экспазіцыі можна ўбачыць прыгожыя вазы для садавіны, графіны, цукарніцы — альянс Фабержэ і рыжскіх майстроў.

Усход — справа тонкая

Паўночны Каўказ прадстаўлены выстаўкай кінжалаў, жаночымі і мужчынскімі паясамі, якія служылі для ўпрыгожвання нацыянальных касцюмаў. Калі прыгледзецца, на жаночых паясах можна ўбачыць манеты, аднак па вазе паясы даволі лёгкія. На манетах пазначаны даты — XIX стагоддзе.

Зала Усходу прадстаўляе чатыры краіны — Манголію, Узбекістан, Японію і Кітай. У цэнтры экспазіцыі — адметныя японскія вазы. Адна з іх выканана з бронзы, а зверху пакрытая фаянсам і эмалевымі роспісамі, у тым ліку пазалотай. Кітайскія вазы зроблены ў тэхніцы перагародчатай эмалі.

Чаканны посуд майстроў Узбекістана таксама выклікае захапленне. Напрыклад, пасудзіны для захавання вады, зерня, масла. Ёсць і два японскія скруткі, напісаныя на шоўку.

Парцэляна з ляпнінай

Парцэлянавыя ваза для садавіны і камінны гадзіннік зроблены на нямецкім заводзе больш за 100 гадоў таму — на першай мануфактуры, заснаванай у 1709 годзе пад маркай Майсен. Што ж уяўляла сабой традыцыя Майсена? Першапачаткова прадметы былі белымі, але іх пакрывалі ляпнінай — тонкімі кветкамі, скульптурамі людзей і звяроў, пазней парцэляну часам яшчэ і распісвалі.

Другой па значнасці ў Еўропе была мануфактура Вены. Яна славілася тым, што на прадметах выконвалі творы мастацтва, нават уручную капіравалі шэдэўры сусветнага жывапісу.

Ёсць у музеі і паліцы для захоўвання парцэляны, даволі незвычайнай формы. Датуюцца яны канцом XIX стагоддзя. Выкананыя з масіву сасны, зверху пакрытыя шпонай з розных парод дрэва. Дзве такія паліцы былі затрыманыя ў 1973 годзе ў людзей, якія эмігравалі ў Ізраіль. Іншая мэбля гэтай экспазіцыі — стол-бюро для дакументаў, стол-бюро для посуду ў кітайскім стылі — былі затрыманыя ў 1993 годзе ў фуры, якая ішла з Латвіі ў Германію ўначы праз Брэст. У гэтай фуры, акрамя прадметаў мэблі, знаходзілася вялікая партыя кантрабанды. Усе прадметы трапілі ў фонды музея выратаваных каштоўнасцяў — таксама там знаходзіліся карціны, якія ўяўлялі сабой скручаныя ў трубачку палотны.

Пасля знаходжання карцін у такім выглядзе іх, вядома, рэстаўруюць, нацягваюць на падрамнік і ўстаўляюць у раму — каб зноў можна было ўбачыць твор.

Найлепшы сярод марыністаў

Адна з работ, прадстаўленая пасля рэстаўрацыі, — аўстрыйскага мастака Шонберга, 1916 года. Гэта выдатны партрэт маці і дзіцяці, на якім можна ўбачыць вельмі тонкае пісьмо дзіцяці — не кожнаму мастаку ўдаецца так жыва напісаць партрэт немаўляці. Прадстаўлены партрэт дзяўчынкі з ружовым бантам 1900 года — аднак гэта карціна моцна пацярпела, палатно парвалася, фарба ў некаторых месцах пасыпалася.

Ёсць асобная пейзажная зала. Адна з затрыманых карцін адразу была ў раме — гэта праца Юлія Клевера «Пейзаж ля возера». У 1993 годзе яна была схаваная ў фургоне. Клевер — даволі вядомы пейзажыст, яго палатно персанальна набыў Аляксандр III, і яго карціны на аўкцыёнах каштуюць даволі дорага.

У зборах музея ёсць творы вядомага марыніста Івана Айвазоўскага. Прадстаўленыя карціны Айвазоўскі пісаў для ўпрыгожвання кабінета за 2-3 гадзіны па памяці. За сваё жыццё мастак напісаў каля шасці тысяч палотнаў. Асабліва добра ў яго атрымлівалася выяўляць месяцавае святло і яго адлюстраванне на вадзе і скрозь ваду — акурат гэта відаць на карціне «Марскі пейзаж».

Таксама ў брэсцкім музеі можна ўбачыць работы Міхаіла Урубеля, Фернана Лежэ і многіх іншых адметных мастакоў. Зрэшты, кожны знойдзе ў «Выратаванцы» тое, што зацікавіць менавіта яго.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Вікторыі ЛЯЎКОЎСКАЙ.
г. Брэст.

Годовой отчет за 2018 год
ООО «Санта Ритейл»
Годовой бухгалтерский баланс за 2018 год утвержден на очередном общем собрании участников ООО «Санта Ритейл» 29.03.2019 года (протокол № 12).

Бухгалтерский баланс на 31.12.2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

Активы	Код строки	На 31.12.2018	На 31.12.2017
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	80667	51248
Нематериальные активы	120	1930	1118
Вложения в долгосрочные активы	140	10079	2841
Долгосрочные финансовые вложения	150	65078	2377
Прочие долгосрочные активы	180	39	
ИТОГО по разделу I	**190**	**157793**	**57584**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	20667	14687
в том числе: материалы	211	1089	801
готовая продукция и товары	214	19578	13886
Расходы будущих периодов	230	325	175
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	2185	548
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	5390	2767
Краткосрочные финансовые вложения	260	27904	14370
Денежные средства и их эквиваленты	270	7617	5451
ИТОГО по разделу II	**290**	**64088**	**37998**
БАЛАНС	**300**	**221881**	**95582**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31.12.2018**	**На 31.12.2017**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	54288	34288
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	3570	1950
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	10010	7024
ИТОГО по разделу III	**490**	**67883**	**43277**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	109099	20693
Отложенные налоговые обязательства	530	95	45
Доходы будущих периодов	540		2
ИТОГО по разделу IV	**590**	**109194**	**20740**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		400
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		600
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	44802	30561
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	40196	28853
по авансам полученным	632	7	6
по налогам и сборам	633	196	127
по социальному страхованию и обеспечению	634	315	232
по оплате труда	635	1226	865
по лизинговым платежам	636	2616	438
прочим кредиторам	638	246	40
Доходы будущих периодов	650	2	4
ИТОГО по разделу V	**690**	**44804**	**31565**
БАЛАНС	**700**	**221881**	**95582**

Отчет о прибылях и убытках за январь–декабрь 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2018	За январь – декабрь 2017
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	286268	220336
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(235340)	(180679)
Валовая прибыль (010-020)	030	50928	39657
Управленческие расходы	040	(5356)	(3566)
Расходы на реализацию	050	(52208)	(37426)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(6636)	(1335)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	13079	5978
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1608)	(1680)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	4835	2963
Доходы по инвестиционной деятельности	100	10894	4837
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	5277	3577
проценты к получению	103	2771	93
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	2846	1167
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(7315)	(3693)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(6863)	(3669)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(452)	(24)
Доходы по финансовой деятельности	120	4778	17
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	4778	17
Расходы по финансовой деятельности	130	(9875)	(876)
в том числе: проценты к уплате	131	(2967)	(820)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(6906)	(53)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(2)	(3)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(1518)	285
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	3317	3248
Налог на прибыль	160	(279)	(486)
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	(51)	(18)
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(1)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	2986	2743
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1620	
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	4606	2743

По аудиторскому заключению от 25 марта 2019 года аудиторской организации – ООО «Аудиторский центр «Эрудит» *(220116, г. Минск, проспект газеты «Правда», 11 А, первый этаж офисного модуля А, кабинет 2, свидетельство о государственной регистрации зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191404329 решением Минского городского исполнительного комитета от 26.04.2010)* годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Санта Ритейл» по состоянию на 31 декабря 2018 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь